*В.В. КНЫШ*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ НІЗЫ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Характеризуются различные слои социальной дезорганизации женщин, анализируются данные по сословной и национальной принадлежности проституток, их вероисповеданию, образованию, возрасту и семейному положению, по направлениям их профессиональной деятельности, количеству и видах организации публичных домов.

Various layers of social disorganization of women are analyzed in the article. It gives data on class and nationality of prostitutes, their religion, education, age and marital status, directions of their professional work, the number and kinds of the organization of public houses.

Неад'емнай характарыстыкай любой грамадскай сістэмы з'яўляюцца элементы сацыяльнай дэзарганізацыі. У асобную праблему выдзелім прастытуцыю - шматгранную з'яву ў гісторыі чалавецтва. Пад прастытуцыяй трэба разумець прымусовы або добраахвотны гандаль жанчын уласным целам у выглядзе промыслу, які з'яўляецца асноўнай або дадатковай крыніцай сродкаў існавання. Дзяржава і яе інстытуты, не маючы магчымасці забяспечыць нармальнае існаванне ўсіх слаёў грамадства, цярпіма адносіліся да гэтай з'явы.

У жніўні 1889 г. Цэнтральны Статыстычы Камітэт (ЦСК) пад кіраўніцтвам А. Дуброўскага правёў і надрукаваў вынікі даследавання шматтысячнага «класа афіцыйна зарэгістраваных прастытутак» па ўсёй імперыі «Проституция в Российской Империи», у якім была прадстаўлена інфармацыя па саслоўнай і нацыянальнай іх прыналежнасці, веравызнанню, адукацыі, узросту, сямейнаму становішчу, віду прастытуцыйнай дзейнасці, па колькасці і арганізацыі дамоў распусты і г. д. Адзначым, што даследаванняў такога маштабу і такой высокай навуковай якасці не існавала нават у замежнай літаратуры таго часу. Пытанні былі распрацаваны ЦСК і медыцынскім дэпартаментам МУС. Звесткі аб кожным публічным доме, кожнай арганізаванай прастытутцы і прастытутцы-адзіночцы збіраліся паводле асобнага апытальнага ліста. У выніку з'явіліся даволі поўныя дадзеныя, дастатковыя для вывучэння гэтага боку жыцця. Згодна з імі ў Беларусі было 862 прастытуткі[1].

Цікавыя дадзеныя па колькаснаму складу прастытутак Беларусі канца XIX ст. прадстаўлены і ў Першым перапісе насельніцтва 1897 г. Згодна з ім па пяці беларускіх губернях іх налічвалася 479 чалавек[2]. Гэта лічба амаль у два разы ніжэй за паказчык А. Дуброўскага, але ва ўмовах сацыяльна-эканамічных змен, якія адбываліся на Беларусі, прастытуцыя магла толькі павялічвацца. Дадзеныя перапісу насельніцтва магчыма растлумачыць недакладнасцю сабранай інфармацыі ў сувязі з нежаданнем жанчын іх абнародаваць. Між тым навукоўцы адзначаюць, што дакладную «лічбу публічных жанчын не ведае ніхто, нават самае лепшае статыстычнае бюро», магчыма толькі меркаваць, што для атрымання прыблізнай колькасці прастытутак неабходна афіцыйныя дадзеныя памножыць у 5-10 разоў[3].

Галоўны кантынгент прастытутак на Беларусі ў XIX ст. традыцыйна складалі мяшчанкі (63,2 %) і сялянкі (25,9 %); дваранкі і ганаровыя грамадзянкі - адпаведна 2,4%, 1,2%; мізэрны працэнт - жанчыны духоўнага саслоўя - 0,5 %[4]. Пераважны працэнт сярод прастытутак ніжэйшых саслоўяў растлумачваецца як вялікім складам гэтых саслоўяў, так і іх дрэнным матэрыяльным забеспячэннем, а таксама нізкім інтэлектуальным узроўнем.

Размеркаванне па канфесійных трупах выглядала наступным чынам: жанчыны іудзейскага веравызнання - 322 (37,3 %), рымска-каталіцкага - 284 (32,9%), праваслаўнага - 214 жанчын (24,8%), пратэстанцкага - 26 (3,1 %). Прастытуткі праваслаўнага веравызнання складалі амаль палову (49 %) у Магілёўскай губерні, найменшы іх працэнт назіраўся ў Гродзенскай губерні - 18 %, дзе пераважалі прастытуткі рымска-каталіцкага веравызнання (52 %);

прастытуткі іудзейскага веравызнання складалі найбольшы працэнт у Мінскай губерні - 55,8, а па астатніх губернях ён амаль роўны (ад 31 да 36 % ) .

Даследаванне А. Дуброўскага прадстаўляе звесткі па нацыянальнаму складу прастытутак: рускія складаюць 37,4 %, яўрэйкі - 36,8 % і полькі - 20,9 %. Дадзеныя перапісу насельніцтва даюць некалькі іншыя лічбы: большасць належыць прастытуткам яўрэйскай нацыянальнасці-43,2 %, працэнт рускіх і беларусак аднолькавы - 19,2 % і прастытуткі-полькі - 14,6 %.

Пераважную большасць складаюць прастытуткі з бедных сем'яў - 56,5 % (арганізаваных - 49,3 %, адзіночак - 64 %), з заможных сем'яў - 14,3 % (прычым прастытутак дамоў распусты - 19,5 %, а адзіночак - 9 %), толькі 1,3 % жанчын паходзяць з багатых сем'яў і становішча ў 27,8 % невядома[6].

Вывучаўся таксама і склад сямей, з якіх яны выйшлі. Больш паловы прастытутак мелі родных: бацьку, маці, дарослых братоў і сясцёр; і звыш 16 % былі круглымі сіротамі. Незамужнія жанчыны пераважалі сярод прастытутак дамоў распусты - 96 %, а замужнія, удовы і разведзеныя сярод адзіночак (3,8 %, 2,2 %, 3,6 % адпаведна). Таксама прааналізавалася і мацярынства прастытутак: дзяцей мелі 5 % незамужніх, 33 % замужніх жанчын дамоў распусты і 8,4 % незамужніх, 38 % замужніх і 13 % разведзеных прастытутак-адзіночак. Трэба адзначыць, што прастытуткам наогул забаранялася трымаць пры сабе малалетніх дзяцей[7].

Паводле дадзеных А. Дуброўскага, большая частка з іх не мела ніякай адукацыі (90 %). Толькі адна прастытутка-адзіночка (0,1 %) атрымала адукацыю ў ВНУ, 4,9 % навучаліся ў пачатковых вучылішчах, 3,5 % - дома, 1,6% - у прытулках, 1,6% - у гімназіях, і толькі 2,9% прастытутак маглі чытаць і пісаць. Трэба адзначыць, што ўзровень адукацыі сярод прастытутак публічных дамоў быў вышэй, чым прастытутак-адзіночак (17,5% і 13 % адпаведна).

Засяродзім увагу на ўзросце, у якім дзяўчаты траплялі ў дамы распусты. Выяўляецца, што большасць (58 %) паступіла туды ва ўзросце ад 12 да 18 гадоў; з 18 да 25 гадоў - 41,3 %, а пасля 26 - толькі 0,7 %. Некалькі іншае становішча назіраецца ў прастытутак-адзіночак: 12-18 год (52 %), з 18 да 25 год (42 %), 26-38 год (6 %). Перавага маладога ўзросту ў арганізаваных прастытутак абумоўлена, з аднаго боку, камерцыйнымі меркаваннямі ўтрымальніцы дома, а з другога - адсутнасцю ў іх сродкаў і жыццёвага вопыту для самастойнага і незалежнага жыцця.

Большасць даследчыкаў у Расіі адзначалі, што прастытуцыі спрыяюць як безвыніковая матэрыяльная патрэба, так і заканадаўчая незабяспечанасць жанчыны на рынку працы[8]. Але развіццю прастытуцыі садзейнічалі не толькі неспрыяльныя эканамічныя ўмовы, заняпад грамадскай маралі, а таксама разумовыя хібы асобы, імкненне да быстрага і лёгкага заробку, прыродныя распусныя схільнасці[9].

Частка беспрацоўных траплялa ў прастытуцыю, таму што попыт на жаночую работу быў невялікі і плата за яго мізэрнай. Але галоўным сродкам уцягвання у гэтую сферу заставаўся падман жанчын: часцей за ўсё ў стане глыбокага ап'янення іх гвалтавалі «прысяжныя мужчыны», якія наймаліся дамамі распусты, затым пад пагрозай абнародавання страчанай нявіннасці і прад'яўлення неаплачаных рахункаў гасілі волю супраціўлення дзяўчын і прымушалі займацца прастытуцыяй. Жанчын куплялі таксама ў фабрычна-завадскіх цэнтрах на сродкі фабрычнага агента па той жа схеме. Часам у газетах, канторах даведак гандляры друкавалі свае аб'явы, прапануючы маладым жанчынам месцы эканомак, буфетчыц, прыслугі, або проста шукалі дзяўчыну на добрааплачваемае месца. На самой жа справе папаўнялася колькасць прастытутак. Такім чынам, агульнае становішча большасці жанчын, паспрыяўшае іх непрыстойнаму занятку, магчыма акрэсліць так:

малады ўзрост, адсутнасць апоры ў сям'і, маленькі заработак або беспрацоўе[10].

Даследчыкі выяўляюць дзве формы прастытуцыі: афіцыйную (паднаглядную) і неафіцыйную (грамадскую). Першая знаходзілася пад улікам і кантролем з боку дзяржаўных органаў, другая насіла скрыты і самастойны характар. Трэба адзначыць, што тайная прастытуцыя - гэта самая вялікая і разнастайная форма, якая ўключае жанчын усіх званняў, саслоўяў, грамадскага становішча і ўзростаў. Яна не паддаецца ніякаму падліку. Абедзве формы прастытуцыі мелі падобную ўнутраную пабудову перш за ўсё па двух паказчыках: а) па арганізаванай або самастойнай форме рамяства; б) па тыпу спажыўца і адпаведна прыбыткам - вышэйшая («арыстакратычная», «камеліі»), сярэдняя («мяшчанская») і нізшая («панельная» прастытуцыя)[11].

Арганізаваная частка афіцыйнай прастытуцыі складалася з дамоў распусты трох мадыфікацый у залежнасці ад фінансавых магчымасцей спажыўца: дарагіх публічных дамоў з моднай мэбляй, паркетнымі падлогамі і прыгожымі жанчынамі ў «раскошных сукенках», разлічаных на плацежаздольных спажыўцоў, пакідаючых за вечар да 5 р. Іх у беларускіх губернях налічвалася 18. Вялікая колькасць (26) і варыянтнасць па ўбранству і кошту дамоў менш высокай катэгорыі для спажыўцоў з сярэдняга класа (дробныя чыноўнікі, небагатыя купцы, студэнцтва і малодшых афіцэраў), якія плацілі ад 1 р. за вечар і да 5 р. за ноч. Такая ж колькасць убогіх, тайных дамоў для беднаты (майстравых, салдат, бадзяг і г. д.), якія патрабавалі за паслугі ад 15 кап. да 2 р. Наогул па пяці беларускіх губернях налічвалася ўсяго 70 дамоў распусты, а, напрыклад, у адной толькі Маскоўскай губерні - 113.

Утрымальніцы дамоў распусты эксплуатавалі прастытутак самым бязлітасным чынам. У публічных дамах іх пазбаўлялі пасведчанняў асобы і пераводзілі на поўны пансіён - ім купляліся сукенкі, бялізна, абутак і гатавалася высокакаларыйная ежа (кошт затрат утрымліваўся з іх заробку). Адміністрацыя ўводзіла афіцыйныя разліковыя кніжкі, куды гаспадыня павінна была ўпісваць траты на кожную прастытутку. Але гаспадары абыходзілі гэтыя правілы: упісвалі новыя паслугі, кошт якіх быў неверагодным. Такім чынам яны траплялі ў фінансавую залежнасць, і пры змене гаспадыні яе доўг гасіўся новай і аўтаматычна аднаўляўся. Гэта вечная кабала магла скончыцца толькі смерцю, невылечнай хваробай або выкупам, што здаралася вельмі рэдка. Афіцыйныя прастытуткі дамоў распусты станавіліся «рэччу», «таварам». Строгім абавязкам кожнай з іх з'яўляўся не толькі продаж цела і прадастаўленне розных паслуг, але і павелічэнне абароту гаспадарскага віна. Дарэчы, продаж спіртных напояў - гэта адзін з найбольш выгадных шляхоў росту прыбытку дамоў распусты. Пры невыкананні пажаданняў гасцей або гаспадароў «дзяўчын» падвяргалі цялесным пакаранням і змяшчалі ў халодны і сыры падвал на хлеб і ваду.

Самастойную частку афіцыйнай прастытуцыі складалі жанчыны («жоўтабілетчыцы»), якія працавалі асобна. Яны здымалі комнату або танную кватэру, куды прыводзілі кліентаў галоўным чынам з сярэдняга класа. Сярод іх можна выдзеліць тры тыпы. Перш за ўсё «камеліі», бліскучыя маладыя і дарагія жанчыны. Гэты элітарны, вялікі слой часта меў доступ у свет і паўсвет, наведваў разнастайныя свецкія ўвесяленні.

Другая разнавіднасць самастойных прастытутак вербавалася з вялікай колькасці дамашняй прыслугі, гувернантак, швей, партніх, мадыстак, фабрычных работніц, салдатак, адзінокіх жанчын і г. д., якія ўвечары падзараблялі ў сувязі з недахопам сродкаў на жыццё. Па словах аднаго з членаў урачэбна-паліцэйскага камітэта, «існуе вялікая колькасць такіх дамоў, дзе тайная распуста распаўсюджана ў самых вялікіх памерах. Амаль ва ўсіх

частках горада існуюць так званыя кватэрныя гаспадыні, якія трымаюць дамы распусты ў поўным значэнні гэтага слова. Яны трымаюць у сябе на кватэры некалькі прастытутак, якія аддаюць гаспадыні ўсе грошы і атрымліваюць адзежу, абутак і інш. У кватэрных гаспадынь часта працуюць жанчыны, якія не знаходзяцца пад урачэбна-паліцэйскім наглядам...»[12] (пераклад аўтара). У мелкіх павятовых гарадах займаліся прастытуцыяй халастыя, замужнія і адзінокія жанчыны, бедныя ўдовы, а часцей за ўсё - «салдаткі». Галоўным чынам гэта былі жанчыны з прыслугі або асоб, занятых на падзённай працы. Займаліся яны промыслам «паміж справай». Многія з іх потым выходзілі замуж і жылі «па-божаску». Іх спажыўцы - сярэдні клас, аплата паслуг дагаварная, але не вышэй дамоў распусты сярэдняй катэгорыі.

Трэці тып складалі самастойныя прастытуткі для сацыяльных нізоў - гэта бедныя, знясіленыя, няшчасныя жанчыны, якія таргавалі сваім целам для набыцця «куска хлеба».

Неафіцыйная прастытуцыя таксама квітнела ў арыстакратычных клубах-прытонах, арганізацыях для сярэдняга класа (танцкласы, кватэрныя «салоны», «сямейныя дамы») і прытонаў («маліны», «углы»). Лёс жанчын ва ўсіх відах гэтага рамяства быў трагічны. Пры арганізаванай прастытуцыі яны маглі спадзявацца на абарону закона, у той час калі неафіцыйныя «працаўніцы» былі абсалютна пазбаўлены правоў і выступалі ў якасці «тавара», «рэчы». Тайная прастытуцыя прадстаўляла масу, з якой увесь час папаўняліся рады зарэгістраваных прастытутак.

Заслугоўвае ўвагі пытанне магчымасцей і шляхоў выхаду з прастытуцыі, прасторавая і сезонная цыркуляцыі, а таксама сацыяльная мабільнасць. Адзначым, што выхад з прастытуцыі быў вельмі складаным. Галоўная прычына - гэта цяжкія невылечныя хваробы (не выпадкова ў афіцыйным пераліку гэта было на першым месцы). Часцей за ўсё старая сям'я не прымала іх, а маральна абуранае грамадства штурхала іх назад у бездань.

Даволі часта выяўляліся сезонныя перамяшчэнні прастытутак. Летам частка іх накіроўвалася ў раскошныя курортныя дамы і на дачы за кошт сваіх палюбоўнікаў. Прамежкавы клас здымаў дачы ў раёнах сярэдняга ўзроўню. Часам шматлікія гаспадыні здавалі не толькі пабудовы, але і сябе. Нават прастытуткі нізоў, як гэта не здзіўляе, часта на лета адпраўляліся за горад і жылі пад адкрытым небам. З наступлением восені ўсе яны зноў перабіраліся ў горад.

Прамыслова-гандлёвыя кірмашы збіралі не толькі значную колькасць мужчын, адарваных ад сваіх сем'яў, але і прастытутак на часовы заробак. Нават некаторыя сталічныя дамы распусты на перыяд правядзення кірмашу перамяшчаліся туды. Жанчыны-распусніцы з акругі таксама адыходзілі ў кірмашовыя гарады на сезонны промысел. Назіралася таксама і статуснае іх перамяшчэнне. Часцей яны праходзілі ўвесь шлях ад арыстакратычнай «камеліі» да нізшых «панельных» прастытутак. «Камеліі» і арыстакраткі багатых дамоў распусты заставаліся ў гэтым палажэнні нядоўга. Часцей са стратай прыгажосці «камеліі» апускаліся да ніжэйшага класа спажыўцоў-сярэдняга. Ці з наступлением «несвоечасовай старасці» траплялі ў самыя ўбогія дамы распусты. Аднак некаторыя зберагалі зароблены капітал і жылі на працэнты, часам станавіліся ўтрымальніцамі дамоў распусты ці эканомкамі.

У прастытутак сярэдняга класа было больш варыянтаў. Частка з іх апускалася ад сціплага дастатку да беспрытульнасці, голаду, холаду сярод натоўпу жабракоў і бадзяг; некаторыя з іх станавіліся гаспадынямі малых дамоў распусты, эканомкамі, ключніцамі прытонаў або тайнымі зводніцамі; некаторыя прастытуткі сярэдняга класа выходзілі замуж, што афіцыйна выводзіла іх з разраду прастытутак. Але часцей за ўсё шлюбы былі

няўдалымі: або іх мужы былі нягодныя і п'яніцы, або жанчыны-распусніцы не маглі стаць добрымі жонкамі і гаспадынямі.

На «панельных» прастытутках паток перамяшчэнняў спыніўся, падняцца ўверх яны не мелі магчымасці. У сярэднім узросце яны задавальняліся пэўнай сытасцю, але ў старасці іх чакалі голад, жабрацтва і невылечныя хваробы. З мэтай абмежавання распаўсюджвання прастытуцыі і венерычных захворванняў Мікалай I у 1840 г. увёў сістэму рэгламентацыі або ўрачэбна-паліцэйскага нагляду за прастытуцыяй, якая з рознымі папраўкамі праіснавала да рэвалюцыі 1917 г.[13] Тых, хто ўхіляўся ад рэгламентацыі, прыцягвалі да «папраўчых спагнанняў» і адказнасці па ст. 44 Устава аб пакараннях за тайную прастытуцыю і прымусова, пасля аплаты вялікага штрафу, залічвалі ў афіцыйныя прастытуткі[14]. У 1891 г. у Мінску быў створаны спецыяльны санітарны камітэт, у абавязкі якога ўваходзіла не толькі сачыць за санітарным станам горада, але і наглядаць за прастытуткамі.

Рэгламентаваныя прастытуткі падпарадкоўваліся асобым паліцэйскім прадпісанням, якія істотна абмяжоўвалі грамадзянскія правы. Яны ўключаліся ў спецыяльныя паліцэйскія ўліковыя спісы і атрымлівалі «жоўты білет» (медыцынскую карту) замест віду на жыхарства, без ведама паліцыі не маглі змяніць кватэру або пакінуць горад. Ва ўсіх выпадках, калі трэба прад'явіць дакументы (працаўладкаванне, пошук кватэры, запіс на курсы ў навучальных установах), яны не маглі ўтаіць свайго ганебнага рамяства: два разы на тыдзень павінны былі з'яўляцца на медыцынскія асмотры і ў выпадку венерычнага захворвання ізаляваліся ў бальніцы. Адзначым, што медыцынскае абслугоўванне ў лячэбных установах яны атрымоўвалі бясплатна. Грамадствам па барацьбе з заразнымі захворваннямі ў 1900 г. была адчынена першая бальніца для прастытутак у Мінску.

Меры паліцыі ў наглядзе за прастытуцыяй зводзіліся да аблаў і затрымання на вуліцах, у тракцірах, начлежных дамах падазроных жанчын. У кожным вялікім горадзе можна было ўбачыць раз у тыдзень абуральную працэсію жанчын, якіх паліцэйскія вялі на медыцынскае пасведчанне. Але не ўсе з іх былі прастытуткамі - памылак было мноства. Агентамі паліцыі хапаліся не толькі бадзягі, басякі і прастытуткі нізшага класа, але і сумленныя жанчыны, якія былі вымушаны з-за беднасці жыць па «кватэрным углам» і начлежкам[15].

Прафілактыка прастытуцыі, а таксама меры грамадскай і прававой барацьбы прапаноўваліся ў якасці эканамічнага падтрымання маладых жанчын, спынення алкагалізму, паляпшэння іх прававога стану, уладкавання прытулкаў для жанчын з дзецьмі, развіцця маральных каштоўнасцей у грамадстве і знішчэння дамоў распусты. Практычна ж прафілактыка праводзілася ў наступных накірунках: у аказанні «працоўнай дапамогі» маладым жанчынам, дзейнасці бюро для адшуквання працоўных месц; у адкрыцці бібліятэк, танных сталовых, вечаровых школ для маладых работніц; ствараліся дабрачынныя ўстановы-прыстанішчы для былых прастытутак, вырашыўшых разарваць з рамяствам, дамы міласэрнасці, прытулкі, дамы працавітасці. Іх было мала, але паказальна, што яны дзейнічалі.

[1] Гл.: Падлічана паводле дадзеных: Дубровский А. Статистика Российской Империи. Т. 13. Проституция в Российской Империи (по обследованию 1 авг. 1889 г.). СПб., 1890.

[2] Гл.: Падлічана паводле дадзеных: Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1903. Вып. IV. Виленская губерния. Тетрадь 3; СПб., 1904. Вып. V. Витебская губерния. Тетрадь 3; СПб., 1903. Вып. XI. Гродненская губерния. Тетрадь 3; СПб., 1905. Вып. XXII. Минская губерния; СПб., 1903. Вып. XXIII. Могилевская губерния.

[3] Гл.: Голосенко И.А. Социологические исследования проституции в России. СПб., 1998. С. 25.

[4] Гл.: Дубровский А. Указ. сач.

[5] Гл.: Там жа.

[6] Гл.: Там жа.

7 Гл.: НГАБ. Ф. 1.Оп. 3. Д. 161. С 18,29,75,792.

8 Гл.: Голосенко И.А. Указ. сач. С. 18.

9 Гл.: Комяк Н.А., Комяк Я.Ф. Проституция и половые извращения (юридические, медицинские, психологические аспекты). Мн., 2003. С. 5.

10 Гл.: Феноменология социальной патологии // Антология социальной работы: В 5 т. М., 1994. Т. 2. С. 110.

11 Гл.: Голосенко И.А. Указ. сач. С. 25.

12 Шашков С.С. Собрание сочинений // Исторические судьбы женщин. Т. 1. Детоубийство и проституция. История русской женщины. СПб., 1898. С. 877.

13 Гл.: Голосенко И.А. Указ. сач. С. 22.

14 Гл.: Шашков С.С. Указ. сач. С. 46.

15 Гл.: Тамжа. С. 872.

Паступіў у рэдакцыю 15.02.05.

***Вольга Валер'еўна Кныш*** - аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Г. Каханоўскі.